Шарапава А.В.
УА “МДУ імя А.А. Куляшова”, Магілёў

# СПЕЦЫФІКА ВЫВУЧЭННЯ ПРОЗЫ ЯНКІ МАЎРА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ У КАНТЭКСЦЕ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “СУСВЕТНАЯ І АЙЧЫННАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА”: ДА ПРАБЛЕМЫ ЖАНРАВАЙ РАЗНАСТАЙНАСЦІ

Літаратурная адукацыя студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў – гэта арганізаваная форма педагагічнага ўздзеяння на асобу, якая можа разглядацца як узаемасувязь розных элементаў педагагічнай сістэмы, скіраваных на падрыхтоўку спецыяліста і развіццё асобы і грамадзяніна. Адукацыйныя стандарты Рэспублікі Беларусь другога пакалення па спецыяльнасцях 1-01 01 01 Дашкольная адукацыя; 1-01 01 02 Дашкольная адукацыя. Дадатковая спецыяльнасць арыентуюць выкладчыка на фарміраванне такіх кампетэнцый пры вывучэнні дысцыпліны “Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура”, як веданне *“<...> спецыфічных якасцяў дзіцячай кнігі, што грунтуюцца на ўліку ўзроставай спецыфікі чытача; заканамернасцяў развіцця <...> дзіцячай літаратуры; характэрных прыкметаў розных жанраў дзіцячай кнігі; відаў работ з канкрэтным тэкстам у дзіцячым садзе; артыкулаў крытыкаў і педагогаў па пытаннях развіцця дзіцячай кнігі; формы прапаганды дзіцячай кнігі ў асяродку выхавацеляў і бацькоў”*, уменне *“<...> выкарыстоўваць першакрыніцы пры вывучэнні гісторыі і тэорыі дзіцячай літаратуры; улічваць узроставыя і індывідуальныя асаблівасці дзяцей у працэсе арганізацыі работы з дзіцячай кнігай; <...> зрабіць крытычны аналіз твораў, адбор кніг для дашкольнай установы; прапагандаваць кнігі ў дашкольнай установе”* [5, с. 19].

У такім кантэксце важным элементам педагагічнай сістэмы з’яўляецца вывучэнне літаратурнай спадчыны Янкі Маўра. На вывучэнне яго творчасці тыпавой вучэбнай праграмай ТД-А.256/ тып. адводзіцца тры аўдыторныя гадзіны: адна лекцыйная і дзве практычныя. Адзначым, што, улічваючы спецыфіку творчасці пісьменніка, вывучэнне гэтай тэмы праводзіцца па жанравым прынцыпе. Зыходзячы з гэтага, студэнтам пастаянна згадваюцца такія паняцці, як “літаратурны род”, “эпас”, “літаратурны жанр”, “раман”, “аповесць”, “апавяданне”, “жанравая мадыфікацыя”, “прыгодніцкая аповесць”, “фантастычная аповесць” і інш.

На лекцыі студэнтам прапануюцца наступныя пытанні: 1. Звесткі з біяграфіі Янкі Маўра (1883 – 1971). 2. Янка Маўр як адкрывальнік новых тэм і жанраў у беларускай дзіцячай літаратуры. 3. Актуалізацыя праблем твораў Янкі Маўра ў ХХІ ст.: гістарычная рухомасць сэнсу мастацкага твора. 4. Спалучэнне рэальнага і фантастычнага ў творах “Вандраванне па зорках” (1927), “Аповесць будучых дзён” (1932), “Фантамабіль прафесара Цылякоўскага” (1954). Наследаванне традыцый А. Талстога, У. Обручава. Пэўная ідэалагічная зададзенасць твораў.

Лепшаму асэнсаванню пытання № 1 спрыяе папярэдняе самастойнае вывучэнне студэнтамі біяграфіі пісьменніка на падставе артыкула з вучэбнага

дапаможніка “Беларуская дзіцячая літаратура” [1, с. 197-200], а таксама аўтабіяграфічнай трылогіі Янкі Маўра “Шлях з цемры” (1948 – 1957). Непасрэдна на лекцыі адбываецца актуалізацыя ведаў праз запаўненне храналагічнай табліцы (у слупку “ДАТА” павінны быць наступныя гады: 11.05.1883 г.; 1892 г.; 1895 г.; 1899 г.; 1903 г.; 1906 г.; 1911 г.; пасля 1917 г.; 1923 г.; 1926 г.; 1941 – 1944 гг.; 1948 г.; 3.08.1971 г.; 1972 г.; 1983 г.; 1993 г.).

| ДАТА | ФАКТЫ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ | ЗАЎВАГІ |
|---|---|---|

Пры разглядзе пытання № 2 асобую ўвагу неабходна звярнуць на агляд і абгрунтаванне прычын звароту пісьменніка да новых для беларускай дзіцячай літаратуры тэмаў (жыццё дзяцей у далёкіх краінах, станаўленне чалавека ў дагістарычны перыяд, жыццё і праблемы школьнікаў і інш.), а таксама жанраў, жанравых мадыфікацый (прыгодніцкая аповесць, раман для дзяцей, фантастычная аповесць, псіхалагічны эцюд і інш.). Пры разглядзе пытання № 3 мэтазгодна растлумачыць (або паўтарыць) паняцце “гістарычная рухомасць сэнсу мастацкага твора”, актуалізаваўшы названае паняцце пры разглядзе такіх тэкстаў, як “У краіне райскай птушкі”, “Палескія рабінзоны”, “ТВТ” і інш. Пры разглядзе пытання № 4 неабходна падкрэсліць сувязь творчасці Янкі Маўра і традыцый сусветнай фантастыкі. Для тых студэнтаў, што здольныя выканаць заданне высокага (прадуктыўнага творчага) узроўню, можна прапанаваць падрыхтаваць наступныя паведамленні: “Падарожжа як сэнсаўтваральны элемент фантастычных твораў (на прыкладзе творчасці Янкі Маўра і А. Талстога, У. Обручава, братоў Стругацкіх і інш.)”, “Касмічная тэма як вызначальная рыса фантастычных твораў (на прыкладзе творчасці Янкі Маўра і С. Лема, Р. Брэдберы і інш.)”, “Фантастыка і ідэалагічная зададзенасць: прынцыпы ўзаемадзеяння (Янка Маўр і Герберт Уэлс)”.

У нашай практыцы выкладання дысцыпліны “Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура” выпрацавана сістэма работы, што прадугледжвае пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў выкананне пэўнага комплексу заданняў, якія садзейнічаюць фарміраванню і развіццю вызначаных вышэй кампетэнцый. Студэнты працуюць самастойна, звяртаюцца да кампетэнтных крыніц з тым, каб пацвердзіць ці абвергнуць свае думкі і гіпотэзы.

На практычных занятках студэнтам прапануюцца наступныя пытанні для вывучэння і абмеркавання, а таксама практыкаванні.

1. Распрацоўка тэмы жыцця дзяцей у цыкле твораў пра далёкія краіны (“Слёзы Тубі”, “Лацароні”, “Незвычайная прынада” (усе – 1927)). Вобразы дзяцей у апавяданнях. Выхаванне пачуцця суперажывання. Роля эпілогаў у раскрыцці ўнутранага канфлікту.

Практыкаванне 1. Прачытайце мастацкія тэксты, прааналізуйце іх.

Практыкаванне 2. Вызначце агульнае і адметнае ў жыццёвых лёсах Тубі, Сідры, Джузепе. Складзіце серыю пытанняў для правядзення гутаркі з дзецьмі па змесце кожнага з твораў, пры гэтым асаблівую ўвагу надавайце выхаваўчаму патэнцыялу тэкстаў.

Практыкаванне 3. Характарызуючы асаблівасці сюжэта, звярніце ўвагу на сэнсаўтваральную ролю эпілогаў. Для даведкі: эпілог – “*<...> сціслае, лаканічнае пасляслоўе, у якім робяцца нейкія высновы-сентэнцыі наконт*

*дзеяння, што адбылося, дзякуецца за ўвагу чытачам ці гледачам, просіцца аб прыхільнасці і г. д.”*[6, с. 139].

2. Трансфармацыя сюжэта рабінзанады ў аповесці “Палескія рабінзоны” (1930). Папулярнасць твора. Вобразы Мірона і Віктара. Апяванне прыроды роднага краю, пазнавальны змест твора, элементы загадкавасці і таямнічасці. Выхаваўчы пафас твора.

Практыкаванне 1. Прачытайце твор. Запішыце элементы трансфармацыі сюжэта рабінзанады, што адрозніваюць твор Д. Дэфо ад аповесці Янкі Маўра (колькасць “рабінзонаў”, першапачатковыя ўмовы існавання, пошукі выхаду з сітуацыі і г. д.). Свае вывады аформіце ў табліцы.

Практыкаванне 2. Вызначце ідэйны змест твора, яго выхаваўча-пазнавальнае значэнне. Для аргументацыі сваіх думак звярніцеся да вершаў М. Багдановіча “Пагоня” і У. Караткевіча “Калумбы зямлі нязнаемай”, а таксама да цытаты з аповесці *“<...> чыталі шмат кніжак, асабліва прыгодніцкіх – Жуля Верна, Майна Рыда, Купера і г. д. Цікавілі іх розныя далёкія краіны, дзікуны, індзейцы, якіх цяпер бадай ужо зусім няма. Захапляліся рознымі прыгодамі з іх жыцця, што адбываліся гадоў 60 – 80 назад. Марылі пра пальмы, джунглі, а не бачылі добрай пушчы, якая была за некалькі дзесяткаў кіламетраў ад іх. Уяўлялі сабе розныя паляванні на тыграў, сланоў, ільвоў, а вавёркі на волі не бачылі. Марылі пра мора, караблі, а не бачылі вялікага возера, якое ляжала за кіламетраў дваццаць ад іх”* [3, с. 129].

Практыкаванне 3. Пейзажныя карціны ў творы поліфункцыянальныя. Падбярыце фрагменты аповесці, у якіх паказальна б рэалізоўваліся такія функцыі, як абазначэнне месца і часу дзеяння, сюжэтная матывіроўка дзеяння, псіхалагічная, функцыя формы прысутнасці аўтара.

Практыкаванне 4 (высокага (прадуктыўнага творчага) узроўню). Паглядзіце кінафільм “Палескія рабінзоны” (1934), рэж. І.Бахар, Л.Малчанаў. Ці будзе ён актуальным у наш час? Свой адказ аргументуйце.

3. Асаблівасці адлюстравання дзіцячай душы ў псіхалагічных апавяданнях “Шчасце” (“Шапка”), “Бярозавы конь”, “Падарожжа вакол дома”, “На крызе”.

Практыкаванне 1. Выпішыце азначэнне тэрміна “псіхалагізм” з літаратуразнаўчага, філасофскага, псіхалагічнага слоўнікаў, параўнайце іх.

Практыкаванне 2. У прапанаваных тэкстах вызначце вядучую рысу дзіцячай душы і свядомасці. Абгрунтуйце свой адказ пісьмова.

Практыкаванне 3. Напішыце міні-эсэ на тэму “Маё шчасце”.

4. Праблема “дзеці і вайна” ў апавяданнях “Завошта?”, “Дом пры дарозе”, “Запіска”, “Максімка”, “У разведцы”.

Практыкаванне 1. Прачытайце творы. Успомніце, што ў 1948 г. Янка Маўр прыняў прапанову стаць галоўным рэдактарам кнігі пісем-успамінаў дзяцей – удзельнікаў і сведкаў Вялікай Айчыннай вайны “Ніколі не забудзем”. Вызначце агульныя і адметныя асаблівасці мастацкіх (творы Янкі Маўра пра вайну) і дакументальна-мастацкіх (зборнік “Ніколі не забудзем”) тэкстаў.

Практыкаванне 2. Пры аналізе апавяданняў звярніце ўвагу на разнастайнасць манеры аповеду, супаставіўшы ў гэтым аспекце апавяданні "Максімка" і "Дом пры дарозе". Свае супастаўленні запішыце.

Практыкаванне 3. Знайдзіце ў апавяданнях апісанне свету дзіцячых уяўленняў і фантазій і вызначце сродкі мастацкай выразнасці, што ў іх выкарыстоўваюцца.

Самастойная работа студэнтаў выконваецца па наступным алгарытме: выкананне практыкаванняў, пісьмовае іх афармленне ў сшытку для самастойнай работы, праверка выкладчыкам гэтых практыкаванняў (франтальная або выбарачная). Неабходна адзначыць, што змест самастойнай работы вядомы студэнтам ужо з самых першых этапаў вывучэння дысцыпліны. Па тэме "Янка Маўр" прапануюцца наступныя практыкаванні.

1. Падумайце, што паўплывала на выбар тэмы першай аповесці пісьменніка "Чалавек ідзе" (1927). Абгрунтуйце свае думкі.

2. Вызначце гістарычныя падзеі, што сталі прататыпнай асновай прыгодніцкіх аповесцяў "У краіне райскай птушкі"(1928), "Сын вады" (1928), рамана для дзяцей "Амок" (1929). Успомніце, якія грамадска-палітычныя сітуацыі сённяшняга дня могуць выступаць у якасці сэнсавых паралеляў падзеям названых мастацкіх тэкстаў. Вывады запішыце.

3. Вызначце і запішыце асноўныя сюжэтныя лініі названых вышэй прыгодніцкіх аповесцяў і рамана. Звярніце ўвагу на тое, як розныя па змесце і характары творы падводзяць сваіх рэцыпіентаў да пастаноўкі і вырашэння найбольш важных агульначалавечых праблем. Запоўніце табліцу. Для даведкі: праблема – складанае пытанне рэчаіснасці, якое пастаўлена аўтарам у літаратурным творы і якое патрабуе вырашэння (хоць можа застацца нявырашаным) як у мастацкай прасторы тэксту, так і ў грамадскім быцці пэўнага часу; той бок жыцця, які асабліва цікавіць пісьменніка.

| | "У краіне райскай птушкі" | "Сын вады" | "Амок" |
|---|---|---|---|
| Праблема чалавечых узаемаадносін | | | |
| Праблема бацькоў і дзяцей | | | |
| Праблема сацыяльнай несправядлівасці | | | |
| Праблема правоў чалавека | | | |
| Экалагічная праблема | | | |
| Праблема кахання | | | |

4. Знайдзіце ў прапанаваных мастацкіх тэкстах апісанні прыроды, вызначце ў іх сродкі мастацкай выразнасці. Акрэсліце пазнавальнае значэнне пейзажу. Для даведкі: пейзаж – вобраз прыроднага асяроддзя, *"<...> апісанне "любой незамкнёнай прасторы знешняга свету" <...>"* [6, с. 129].

5. Вызначце ў аповесці "ТВТ, або Апавяданне пра тое, як маладыя героі ўзбунтаваліся супроць уціску рэчаў і збілі з панталыку дзядзьку Данілу, цётку Мар'ю, нават міліцыянера і, нарэшце, увесь свет; як яны навучыліся бачыць тое, чаго другія не бачаць, і як Цыбук здабываў ачкі" (1934) тэму, праблемнае поле, ідэйны змест, выхаваўча-пазнавальнае значэнне. Свае адказы запішыце. Пазначце, якія творы "школьнай" тэматыкі вядомыя вам з сусветнай і айчыннай дзіцячай літаратуры.

6. Вызначце ў аповесці “ТВТ” элементы гульні (напрыклад, загадкавая назва, атмасфера спаборніцтва). Адкажыце, з якой мэтай пісьменнік выкарыстоўвае названыя і іншыя элементы гульнёвага характару.

7. Аб’яднаўшыся ў групы па 5-6 чалавек, прыдумайце праект, які можна было б рэалізаваць з выхаванцамі, напрыклад, “Дапамагаем бацькам”, “Прыбіраем групу”, “Чытаем кнігі” і інш. Напішыце абгрунтаванне падобнай формы работы з дзецьмі, яе ідэйны змест, выхаваўча-пазнавальнае значэнне, магчымасць рэалізацыі праектаў у розных узроставых групах.

Такім чынам, прапанаваная сістэма вывучэння тэмы “Янка Маўр” з улікам жанравай спецыфікі спрыяе фарміраванню ў будучага спецыяліста названых у пачатку дадзеных матэрыялаў кампетэнцый, садзейнічае найбольш поўнаму выяўленню здольнасцяў студэнтаў, а таксама своечасоваму правядзенню папераджальных і карэктуючых дзеянняў, уцягвае ў працэс пазнання ўсіх навучэнцаў. Сістэма апераджальных заданняў дае магчымасць студэнтам спрагназаваць уласны ўзровень сваіх вучэбных дасягненняў і супаставіць іх з крытэрыямі вучэбных патрабаванняў.

Літаратура:

1. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А.М.Макарэвіч [і інш.]; пад агул. рэд. А.М.Макарэвіча, М.Б.Яфімавай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – С. 197 – 220.
2. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях : 1-01 02 01 Пачатковая адукацыя; 1-01 02 02 Пачатковая адукацыя. Дадатковая спецыяльнасць / склад. В.І. Караткевіч, А.М. Макарэвіч. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2005. – 40 с.
3. Маўр, Я. Выбраныя творы. Аповесці, апавяданні / Я. Маўр. – Мінск : Дзярж. Выд. БССР. Рэд. маст. літ., 1952. – С. 127-271.
4. Мировая и отечественная детская литература : типовая учебная программа для высших учебных заведений по специальностям : 1 - 01 01 01 Дошкольное образование; 1 - 01 01 02 Дошкольное образование. Дополнительная специальность / сост. И.Г. Добрицкая, О.Б. Нестерович. – Минск, 2009. – 35 с.
5. Образовательный стандарт Республики Беларусь. Высшее образование. Первая ступень : Специальность – 1-01 01 01 Дошкольное образование : Квалификация – педагог = Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень : Спецыяльнасць – 1-01 01 01 Дашкольная адукацыя : Кваліфікацыя – педагог.
6. Яцухна, В.І. Тэорыя літаратуры : дап. для студ. філал. спец. ВНУ / В.І. Яцухна. – Гомель : ГДУ імя Францыска Скарыны, 2006. – 279 с.